*УДК 378.016:811.161.1-0.54.6(075.8)«1900/1914»*

**Любецкая Кацярына Пятроўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь
Электронная пошта: *katerina_lingvo@mail.ru*

**Liubetskaya Katsiaryna**, Candidate of Philological Sciences, Associate Professor
Belarusian State University, Minsk, Belarus
e-mail: *katerina_lingvo@mail.ru*

# РОЛЯ ВЫДАВЕЦКІХ СУПОЛАК У ПАДРЫХТОЎЦЫ ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў 1900–1914 ГГ.

*У артыкуле акрэсліваецца значэнне беларускіх выдавецкіх суполак у адраджэнні беларускай справы ў пачатку XX ст. Вызначаюцца цэнтры беларускага кнігавыдання і іх роля ў станаўленні нацыянальнага школьніцтва і развіцця беларускай мовы.*

*Ключавыя словы: выдавецтва; кнігадрукаванне; школьніцтва; вучэбны тэкст; беларуская мова.*

# THE ROLE OF PUBLISHING ASSOCIATIONS IN THE PREPARATION OF EDUCATIONAL LITERATURE IN 1900–1914

*The article outlines the importance of Belarusian-language publishing communites in the revival of the Belarusian cause at the beginning of the 20$^{th}$ centure. The centres of Belarusian book publishing and the role of educational text in the formation of national schooling and the development of the Belarusian language are determined.*

*Key words: publishing house; book printing; school education; educational text; Belarusian language.*

Станаўленне беларускай культуры і мовы ў пачатку ХХ ст. адбывалася ў цеснай сувязі з ходам гістарычных падзей і ростам нацыянальнага руху. Ідэолагі “заходнерусізма” прытрымліваліся той думкі, што “Беларусь не з’яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але што яна з’яўляецца культурнай і дзяржаўнай часткай Расіі і таму павінна разглядвацца як адзін з яе састаўных элементаў” [1, с. 7]. У той жа час польскі бок, выконваючы т.зв. “вялікую культурную місію палякаў на Усходзе”, трымаўся ідэі “гістарычнага права Польшчы на Беларусь” [2, с. 19].

Ва ўмовах палітычна-эканамічнай несвабоды беларусаў у складзе Расійскай імперыі ў пачатку ХХ ст. лідары беларускай справы змагаліся за нацыянальна-культурнае адраджэнне роднага краю. Галоўным атрыбутам нацыянальнага абуджэння свядомасці беларусаў вызначалася мова. Так, напрыклад, нашаніўскі публіцыст С. Палуян пісаў: “Нам у першую чаргу трэба адрадзіць сваю мову… Толькі адрадзіўшы мову, мы зможам паставіць на цвёрды грунт наш рух” [3, с. 228].

Адной з важных задач нацыянальна-культурнага адраджэння ў пачатку ХХ ст. стала ідэя стварэння нацыянальна-беларускіх школ з выкладаннем на роднай мове. У пачатку ХХ ст. па-беларуску можна было вучыцца ў прыватных школах (выпускнікі пры гэтым не атрымлівалі ніякіх правоў), у жаночых гімназіях Паўночна-Заходняга краю. Менавіта ў гэты час пашыраецца сетка т.зв. “тайных школ”, у якіх выкладанне вялося і на беларускай мове[1].

Пад уздзеяннем рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. і ўздыму нацыяльнага руху царскі ўрад быў вымушаны карэктаваць свае адносіны да беларускай мовы. Згодна з выдадзеным урадам у лістападзе 1905 г. законам “Аб свабодзе друку” была знята забарона на друк твораў беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Істотную ролю ў справе пашырэння нацыянальнай культурна-асветнай працы і папулярызацыі беларускай кнігі адыгралі выдавецтвы пачатку ХХ ст., прыярытэтным для якіх стала падрыхтоўка навучальнай літаратуры. “Выданне кнігі для чытання на беларускай мове ва ўмовах царскай Расіі

[1] “Тайныя” школы адрозніваліся ў залежнасці ад нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці вучняў і іх бацькоў. Сярод праваслаўнага насельніцтва былі распаўсюджаны руска-беларускія школы. У Гродзенскай губерні, дзе была значнай удзельная вага каталіцкага насельніцтва, атрымала пашырэнне “тайнае” польскае навучанне [4, с. 228].

з'явілася важнай грамадска-палітычнай з'явай. Дасканалая з боку формы і зместу, яна спалучала выхаваўчыя задачы з багаццем і прыгажосцю роднай мовы, і магла на тым часе замяніць народу і школу, і падручнік" [5, с. 165].

З мэтай патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення пачынаецца падрыхтоўка літаратуры вучэбнага характару для задавальнення патрэб пачатковай школы і выкладання абавязковых для вывучэння дысцыплін з розных гуманітарных галін: літаратуразнаўства, мовазнаўства, рэлігіязнаўства.

Першай грамадскай культурна-асветнай арганізацыяй, якая паставіла сабе за мэту наладжванне выдавецкай працы на беларускай мове, выданне і папулярызацыю беларускай кнігі і ажыццяўленне культурна-асветніцкай працы становіцца "Круг беларускай народнай прасветы" (Пецярбург, 1902).

Легальнае выдавецтва "Загляне сонца і ў наша ваконца" (Пецярбург, 1906) "устанаўліваецца для таго, каб друкаваць і шырыць памеж людзёў ксёнжкі беларускія і ўсё, што датычэ Беларусі". Лічачы адной з галоўных мэт асвету, супрацоўнікі выдавецтва пачалі сваю дзейнасць з падрыхтоўкі навучальнай літаратуры. "Можа хто спытаецца: а ці ёсць якія кніжкі да навукі? Вото ж скажам, што ёсць – праўда, мала, небагата, але не забывайце, што толькі першы год, як нам, беларусам, дазволілі друкаваць кніжкі па-нашаму, такімі літарамі, якія нам патрэбны – і польскімі, і рускімі (раней дазвалялі друкаваць толькі рускімі) … а, дасць бог, хутка будзе болей, каб аб усім, што чалавеку патрэбна, можна было прачытаць у сваёй роднай мове". Для выкладання літаратуры ў выдавецтве рыхтуюцца Першае чытанне для дзетак беларусаў Цёткі (1906) [6], "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" К. Каганца (1906) [7]. Для пазнання навукі пісьма рыхтуецца Беларускі лементар, або першая навука чытання К. Каганца (1906) [8].

Кнігадрукаванне ў Вільні (культурным цэнтры Заходняга краю) пачынаецца з дзейнасці "Нашай нівы", якая "вызначыла неабходныя ўмовы развіцця беларускай нацыі, яе самастойнасці сярод славянскіх народаў, выдзяляючы галоўныя кампаненты нацыянальнага адраджэння: мову, літаратуру, культуру, гісторыю, эканоміку" [9, с. 82–83]. Газета, прапагандуючы ідэю асветы на нацыянальнай мове, стала арганізацыйным цэнтрам беларускай школы.

У Вільні у друкарні М. Кухты выходзіць даведнік па літаратуры "Першая чытанка: Кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытання" В. Ластоўскага (1906) [10].

Кнігавыдавецкае таварыства "Наша хата" (Вільня, 1906) склала праграму выдання падручнікаў для беларускіх школ і засяродзіла сваю ўвагу на падрыхтоўцы беларускіх падручнікаў і дзіцячай літаратуры. Супольна з выдавецтвам "Загляне сонца і ў наша аконца" у гэты час падрыхтаваны даведнік па літаратуры "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" Я. Коласа (1909) [11].

Віленскі біскуп Э. Роп адзін з першых загаварыў пра неабходнасць выкладання на беларускай мове: "Беларуская мова павінна быць на справе, а не на словах прызнана гаворкай, якая мае права на існаванне і развіццё, а таму прынята і вывучацца нараўне з велікарускай мовай… Пры тлумачэнні дзецям ісцін веры, што вывучаюцца з кніг, трэба ўжываць мову, на якой народ раз-

маўляе дома, г.зн. беларускую, і з боку духавенства працаваць у тым сэнсе, каб стварыць агульную, па магчымасці ўсім зразумелую, літаратурную беларускую мову” [12, с. 6]. Для вывучэння рэлігіі на беларускай мове былі падрыхтаваны: “Элементажа для добрых дзетак-католікаў” епіскапа Дзянісевіча (1906) [13], “Кароткі катахізм” ксяндза Будзька (1907) [14], “Кароткая свяшчэнная гісторыя” ксяндза Шустара (1914) [15], “Кароткае выясненне абрадаў Р.-Каталіцкаго касцёла” ксяндза Банчкоўскага (1914) [16].

Для задавальнення пытанняў пабудовы нацыянальнай школы навучальная літаратура рыхтавалася і за межамі беларускага краю. Так, у Львове ў 1906 годзе Цёткай было падрыхтавана выданне “Гасцінец для малых дзяцей” (1906) [17].

З’яўляючыся істотным складнікам беларускамоўнай кніжнавыдавецай прадукацыі пачатку XX ст., беларускамоўныя навучальныя матэрыялы нягледзячы на моцны расійскі ўплыў, мелі цэлы шэраг асаблівасцей. Напярэдадні першай сусветнай вайны “прыхільнікі беларускай школы вылучалі шэраг нацыянальных адукацыйных ідэалаў і каштоўнасцей, без якіх нельга было будаваць беларускую сістэму адукацыі: адданасць роднай мове як галоўная перадумова захавання беларускага народа і яго нацыянальнай свядомасці; неабходнасць пачатковага навучання выключна на беларускай мове; увядзенне ў школьныя праграмы беларусазнаўства; выхаванне на традыцыях народнай педагогікі і фальклору; фарміраванне гістарычнага мыслення і нацыянальнай свядомасці…” [18, с. 151].

Беларускамоўная кніжная справа гэтага часу была скіравана на вызначэнне тэматыкі і мэтавага прызначэння кнігі і арыентавалася перадусім на выхаванне патрыятычнага духу карыстальнікаў. Ва ўмовах адсутнасці беларускіх школ выданне навучальнай літаратуры на аснове нацыянальных каштоўнасцей спрыяла закладванню падмурка народнай адукацыі і станаўленню вучэбна-метадычных асноў на роднай мове. Важна адзначыць, што, дзякуючы выданню навучальных матэрыялаў, і настаўніцкія колы маглі азнаёміцца з канцэпцыяй даведнікаў, скіраваных на задавальненне патрэб беларускай нацыянальнай школы, што ў цэлым магло ўплываць як на з’яднанне настаўніцкіх сіл у справе выкладання на роднай мове, так і на далейшую распрацоўку беларускамоўнай вучэбнай літаратуры.

Прымаючы пад увагу адсутнасць папярэдняга вопыту ў распрацоўцы падобных беларускамоўных прац, падрыхтоўка навучальнай літаратуры ў пачатку XX ст. мела характар наватарскі і спрыяла развіццю адукацыйнага працэсу на роднай мове. Паколькі існуючая казённая школа пачатку XX ст. вызначалася “празмернай адарванасцю ад акаляючай вучня прыроды, жыцця, ад яго непасрэдных уражанняў, назіранняў і ведаў, ад яго матчынай мовы” [19, с. 3], у нацыянальных падручніках адбываўся перадусім пошук сутнаснага напаўнення моўнай адукацыі.

Першыя матэрыялы вучэбнага характару, прасякнутыя любоўю да роднага краю, павінны былі задаволіць чытацкія запатрабаванні вучня пачатковай школы і спрыяць развіццю яго пазнавальных якасцей. Аўтарскія тэксты (аўта-

рамі першых вучэбных матэрыялаў сталі вядучыя пісьменнікі (Цётка, Я. Колас) змяшчалі адаптаваныя да дзіцячага ўспрымання тэксты з абавязковых да вывучэння ў той час сфер: літаратура, мова, рэлігія і базаваліся передусім на найлепшых творах нацыянальнай літаратуры (высокамастацкай мове Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Я. Купалы, Я. Коласа і інш.).

Змест навучальнай літаратуры быў скіраваны на выхаванне асобы сродкамі мовы. Падрыхтаваныя навучальныя матэрыялы праз перадачу хараства роднага краю абуджалі ў школьніка інтарэс да чытання, спрыялі засваенню ім арфаграфічных і граматычных норм, развіццю багацця і правільнасці маўлення, пашыралі моўную культуру навучэнца.

Рыхтуючы беларускамоўныя матэрыялы, аўтары мелі на мэце перадусім навучыць друкаванаму беларускаму слову. Таму ва ўмовах адсутнасці граматыкі беларускай мовы матэрыялы спрыялі выпрацоўцы правілаў беларускай арфаграфіі як лацінкай, так і кірыліцай. Карыстальнікі гэтай літаратуры вучыліся атаясамліваць і адрозніваць графемы роднай сістэмы пісьменнасці.

Такім чынам, ва ўмовах адсутнасці ў беларусаў у пачатку XX ст. сваёй дзяржаўнасці актыўнымі дзеячамі беларускай справы было пастаўлена за мэту змаганне за нацыянальна-культурнае абуджэнне беларускага народа, захаванне яго этнічнай і моўнай адметнасці. Наладжаная сіламі беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі выдавецкая дзейнасць і кнігадрукаванне на беларускай мове, спробы арганізацыі школьніцтва мелі выключнае значэнне для рэалізацыі моўнага аспекта адраджэння Беларусі.

Разумеючы важнасць выхавання падрастаючага пакалення на ідэалах і сімвалах роднага краю беларускімі выдаўцамі закладваўся залаты фонд беларускамоўнай навучальнай літаратуры, засваенне зместу якога арыентавала на вывучэнне духоўнай культуры беларускага народа, спрыяла асэнсаванню ўнікальнасці нацыянальнай мовы.

Станаўленне беларускай выдавецкай справы і кнігадрукавання ў сферы навучальнай літаратуры ў сваю чаргу адыгрывала значную ролю ў авалоданні скарбамі народнай мовы і далейшай распрацоўцы літаратурнай. Задача падрыхтоўкі вучэбнага тэксту і рэалізацыя адукацыйных мэт абумоўлівала тэарэтычна-практычную апрацоўку лексічнага складу беларускай мовы пачатку XX ст., яе граматычнага ладу, фанетыкі і арфаграфіі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Цьвікевіч А. “Западно-руссизм”. Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Мінск : Навука і тэхніка, 1993. 352 с.
2. Сташкевіч М. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. – люты 1917 г. // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 18–23.
3. Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск: Беларуская навука, 2003. 444 с.
4. Каханоўскі А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. : вучэб.-метад. дапаможнік. Мінск : БДУ, 2017. 251 с.
5. Александровіч С. Х. Пуцявіны роднага слова: Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы 19–20 ст. Мінск : БДУ імя У.І. Леніна, 1971. 247 с.

6. Pierszaje czytannie dla dzietak biełarusoŭ / złażyła Ciotka. Pieciarburh : Zahlánie sónce i ŭ násze wakónce, 1906. 30 с.; Першае чытанне для дзетак беларусаў / написала Цйотка. Пецярбург : Загляне сонца і ў наша аконца, 1906. 30 с.
7. Druhoe czytanne dla dziacej belarusaŭ, 1906.
8. Biełaruski lementar, abo Pierszaja nawuka czytańnia / [Karuś Kahanec]. Piciarburh : Zahlanie sonce i ŭ nasze wakonce, 1906. 23 с.; Беларускі лемантар, або Першая навука чытання / [К. Каганец]. Пецярбург : Загляне сонца і ў наша аконца, 1906. 30 с.
9. Слука А. Г. Беларуская журналістыка: падручнік. Мінск : БДУ, 2011. 447 с.
10. Першая чытанка: Кніжыца для беларускіх дзетак дзеля навукі чытаньня. Злажыў В. Ласт. Вільня, друк. М. Кухты, 1906. 64 с.
11. Другое чытанне для дзяцей беларусаў / напісаў Якуб Колас. Пецярбурх [Пецярбург] : выдалі суполкі: "Загляне сонца і ў наша аконца" і "Наша хата", 1909 (вокладка 1910). 110 с.
12. Смалянчук А. Ф. Польскі нацыянальны рух на беларусі і Літве напярэдадні і ў перыяд 1905-1907 гг.: аўтарэф. дыс. … канд. пед. навук. Мінск, 1994. 20 с.
13. Elementarz dla dobrych dzietok katolikou. Pieciarburh, druk. K. Piantkouskaho, 1906. 24 s.
14. Karotki Katachizm dla pryspasableńnia dziaciej da pieršaj Spowiedzi i Kamuńji Światoj / pierarobleny z Katachizmu R. Filachoŭskaho praz X. Wilnia : Drukarnia M. Kuchty, 1907. 32 с.
15. Кароткая сьвяшчэнная гісторыя ксяндза Шустэра. Пецярбург: Акцыйная суполка друкарскай штукі, 1914. 80 с.
16. Karotkaje wyjaśnieńnie abradau R.-Katalickaho kaścioła / ks. D. Bonczkoŭski. Wilnia : Drukarnia "Znicz", 1914. 64 с.
17. Hasciniec dla małych dziaciej / pierełozyŭ z ukrainskaho jazyka na biełaruski z małymi pieremìenami Tymczasowy. [Lwów, 1906]. 16 с.
18. Снапкоўская С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. – Мінск : НІА, 1998. 191 с.
19. Андрэева Е., Лыч Л. У пошуках выйсця // Настаўніцкая газета. 1994. – 12 студз.